ПАЧАТАК ПОДЗВІГУ

«Чалавек не здаецца» — новая кінакарціна, пастаўленая студыяй «Беларусьфільм» (сцэнарый І. Стаднюка, рэжысёр І. Шульман). Назва мужная і вельмі дакладная. Аўтары з поўнай на тое падставай даюць да фільма кароткі ўступ: перад гледачом уваскрэсне сёння, кажа дыктар, нявыдуманая гісторыя; некаторыя з яе герояў, магчыма, пазнаюць сябе на экране, а іншых... іншых пазнаем мы — іх сваякі і блізкія, іх таварышы па зброі.

Так, многія з нас убачаць у фільме сваё салдацкае юнацтва і сталасць.

Адна з вялікіх адзнак мінулай вайны — іменна тое, што савецкая моладзь паказала сябе дастойным нашчадкам бацькоўскай доблесці і славы. Нашы юнакі і дзяўчаты 30—40-х гадоў умелі не толькі браць з удзячнасцю шчасце з рук старэйшага пакалення: разам з бацькамі яны пайшлі ў гарніла свяшчэннай вайны і сталі той самай сілай, што ўшчэнт разбіла агрэсараў.

Аўтары фільма вырашылі паставіць у самым цэнтры падзей зусім маладога, яшчэ не абстралянага воіна *Пятра Марыніна, які толькі што* скончыў ваеннае вучылішча. Фільм з першых жа кадраў сцвярджае асноўную ідэю: чалавек не здаецца тады, калі ў ім з маладосці б'ецца гарачае *сэрца патрыёта.* І таму аповесць аб падзеях дваццацігадовай даўнасці не толькі хвалюе, але і вучыць, выхоўвае моладзь.

Баявая абстаноўка на адным з участкаў пад Гродна складваецца так, што ад волі і адвагі малодшага палітрука Пятра Марыніна залежыць лёс дывізіі: у неверагодна цяжкіх умовах ён імкнецца выратаваць яе баявы сцяг. Цяжкія выпрабаванні першых дзён вайны загартоўваюць у ім волю, вытрымку, вернасць, выхаваныя ў маладога патрыёта яшчэ за школьнай партай і ў ваенным вучылішчы, у піянерскім атрадзе і ў камсамоле.

Вайна разлучыла Пятра і Любу ў той самы дзень, калі яны павінны былі сустрэцца. Абое становяцца франтавікамі, абое самааддана выконваюць воінскі абавязак. І тут можна *было б паспрачацца з аўтарамі карціны,* ці варта *было* звяртацца да элементаў дэтэктыву, якія раптам урываюцца ў тканіну фільма. Думаецца, поўная драматызму і чалавечай прыгажосці гісторыя Пятра, Любы і іх аднапалчан магла б сама па сабе скласці паўнацэнны напружаны сюжэт. На шчасце, прыгодніцка-дэтэктыўныя матывы ўсё ж не засланілі подзвіг Марыніна і іншых танкістаў. Патэтычная тэма баявога сцяга гучыць у лепшых кадрах фільма на поўную сілу. І тэмпераментнае сцвярджэнне — Чалавек не здаецца! — яшчэ вышэй узнімае тэму. Шкада толькі, што ў фільме на долю Любы выпала сузіральная місія. У адным толькі выпадку яна праяўляе сябе актыўным байцом, знішчаючы варожага разведчыка.

У фільме нямала трапна знойдзеных і таленавіта зазнятых эпізодаў і кадраў. Прыгадаем хоць бы раніцу ў лагеры танкістаў — раніцу 22 чэрвеня 1941 г. Прыгадаем кадры народнага гора: ідуць, ідуць па прасёлках і бальшаках бясконцыя натоўпы жанчын, дзяцей, старых — на усход, ад родных мясцін. А насустрач, на захад, ідуць вайсковыя калоны, іх яшчэ мала, куды менш, чым трэба, але яны не папросяць літасці ў баі... Прыгадаем і сцэну ў лесе, калі Пётр Марынін, стомлены і знясілены просіць параненых чырвонаармейцаў пайсці ў бой супраць фашыстаў, якія лютуюць у вёсцы. І вялікая сіла свяшчэннага абавязку ўзнімае на ногі тых, хто, здавалася б, кроку ступіць не здольны...

Есць у кінематографе такія шчаслівыя знаходкі, калі нават самы скупы, без адзінага слова, кадр набывае значнасць абагульняючай думкі. Такі кадр з Пятром Марыніным, які не паспеў даехаць да станцыі, дзе збіраўся ён сустрэць Любу. Пад грукат першых варожых бомб Пётр рашуча і крута паварочвае матацыкл назад. Яму прадстаяла з той самай хвіліны ісці і ісці на захад, ісці доўга, да самай перамогі. І дарэмна аўтары фільма тлумачаць нам гэта дыктарскім тэкстам, нібы не давяраючы сіле вельмі ўдала знойдзенага кадра.

Яшчэ больш ёмісты, напоўнены *думкаю эпізод, калі таварышы па* зброі выносяць з бою цяжка параненага Пятра.

Аператар Уладзімір Акуліч знаходзіць такія моцныя, выразныя ракурсы, што радавы эпізод робіцца сапраўдным сімвалам. Мы бачым жывое аблічча цуда-волатаў, якія мужна абаранілі гонар, славу, жыццё роднага народа...

Фільм, відавочна, выкліча нямала спрэчак, асабліва сярод ветэранаў фронта. Яно і зразумела: жывыя ўдзельнікі ўзноўленых у карціне падзей раўнівыя да незгасальнай памяці тых дзён, да асабістых уражанняў ад першых баёў, поўных трагічных выпрабаванняў і нязгаснай веры ў нашу перамогу. Мне, напрыклад, здаецца перавялічанай пастаўленая на пярэдні план агентурная работа варожага штаба, што прыглушае ў нейкай меры неверагодную сілу баявога адпору, які далі ворагу нашы *салдаты ў першыя дні вайны, нягледзячы* на ўсе няўдачы аператыўна-стратэгічнага парадку. Магчыма, вядома, розныя меркаванні як аб ступені *праўдзівасці ў паказе дзеянняў* войск, так і пра выразнасць таго ці іншага эпізоду, пра ігру таго ці іншага выканаўцы. Але асноўнае бясспрэчна: пісьменнік Іван Стаднюк даў кінематографістам цікавае, хвалюючае апавяданне аб першых днях Вялікай Айчыннай вайны, на экраны выходзіць *баявы патрыятычны фільм.*

Нельга не адзначыць прынцыповую *і прыкметную акалічнасць. Аўтару гэтых радкоў давялося пазнаёміцца са* сцэнарыям І. Стаднюка яшчэ задоўга да пачатку здымкаў. І вось цяпер перад намі гатовы фільм. Ці з'явілася ў ім штосьці новае, шчасліва знойдзенае ў працэсе вытворчасці? Так, з'явілася. Але ці захаваўся сцэнарый у сваёй сутнасці, з усімі асаблівасцямі аўтарскага почырку? Так, мы бачылі на экране ўжо знаёмы нам твор сцэнарыста, перакладзены на жывую мову кінематографа. Нам вядома, што ў рэжысёра-пастаноўшчыка І. Шульмана было нямала творчых пошукаў лепшага, гарачых спрэчак са сцэнарыстам. Але рэжысёр не паследаваў сумніцельнаму прыкладу некаторых «энтузіястаў», якія на словах называюць сцэнарый асноваю фільма, а «ў рабочым парадку» наспех перакройваюць яго да непазнавальнасці. У прынцыповым, але беражлівым стаўленні да літаратурнай асновы фільма варта бачыць адну з рашаючых умоў плённай працы пісьменніка ў кіно.

Аўтарам фільма ўдалося, на наш погляд, прыцягнуць добрыя выканаўчыя сілы. Удалы Валянцін Бураў у ролі Пятра Марыніна. Ён выключна прывабны, просты, пра яго можна сказаць — «такіх многа». А ў гэтым і заключана адна з асноў вобраза! Вонкава стрымана, але з добрым унутраным тэмпераментам іграе ролю камісара Маслюкова артыст Г. Жжонаў. Прывабная Л. Луціна ў ролі Любы, хоць ёй і перашкаджае некаторая інертнасць характару гераіні, як яна выпісана сцэнарыстам.

Фільм «Чалавек не здаецца» выходзіць на экраны напярэдадні 20-годдзя з дня зладзейскага нападу гітлераўскай Германіі на нашу краіну. Расказваючы пра пачатак вялікага подзвігу савецкіх людзей у Айчыннай вайне, ён знойдзе жывы водгук і ў сэрцах ветэранаў-салдат, і ў душы нашай моладзі.

Пётр ХАРКОЎ.

На здымках: кадры з кінафільма «Чалавек не здаецца». 1. Артыстка **Л. Лужына** ў ролі Любы. 2. Артыст **Г. Жжонаў** у ролі батальённага камісара і артыст **Г. Някрасаў** у ролі Назарава (справа).

Карысны семінар

Пры Брэсцкім абласным Доме народнай творчасці адбыўся дзесяцідзённы семінар кіраўнікоў драматычных калектываў. Заняткі праходзілі па асновах рэжысуры і грыму. Для правядзення семінара былі запрошаны рэжысёр рэспубліканскага Тэатра юнага гледача заслужаны артыст БССР В. Пацехін, кансультант абласнога Дома народнай творчасці Н. Ладзейнаў, артыст Тэатра імя ЛКСМБ А. Самараў.

Слухачы пазнаёміліся з метадыкай работы рэжысёра над спектаклем і паказалі падрыхтаваную імі аднаактовую п'есу «Каціна памылка» Эвальд.

Удзельнікі семінара пазнаёміліся з тэхнікаю накладання грыму. Яны праглядзелі ў абласным тэатры спектаклі «Іркуцкая гісторыя», «Два колеры» і спектакль самадзейнага драматычнага калектыву Брэсцкага клуба чыгуначнікаў «Не ўсё кату масленіца».

П. ВЫСОЦКІ.

Факультэт прапагандыстаў кнігі

Гальшанская сельская бібліятэка—лепшая ў Ашмянскім раёне. Больш 13 год кіруе ёю Марыя Аляксандраўна Піваварчук. За гэты час колькасць чытачоў вырасла ў дзесяць разоў.

Па ініцыятыве М. Піваварчук пры бібліятэцы створан факультэт грамадскіх распаўсюджвальнікаў кнігі. Яго слухачы — вучні старэйшых класаў сярэдняй школы. Заняткі, якія вядзе Марыя Аляксандраўна, праходзяць жыва і цікава. Ужо вывучаны тэмы «Агульнае знаёмства з бібліятэкай», «Роля кнігі ў камуністычным выхаванні працоўных», «Формы і метады прапаганды кнігі», «Аб бібліятэчным абслугоўванні насельніцтва Гальшанскага сельсавета» і інш.

Г. НЕЎПАКОЕЎ.

ПРАНІКАЮЧЫ Ў ЖЫЦЦЁ...

Перад намі — дзве невялікія кніжкі, выдадзеныя ў канцы мінулага года. Адна з іх — нарыс Аляксея Кулакоўскага «Зоркі салігорскія» — пра будаўнікоў Салігорскага калійнага камбіната, другая — нарыс Аляксея Карпюка «Мая Гродзеншчына» — расказвае пра жыццё і працу калгаснікаў, рабочых, інтэлігенцыі — землякоў пісьменніка. З абодвух нарысаў паўстае багаты падзеямі наш сённяшні дзень, паўстаюць вобразы простых, шчырых, працавітых савецкіх людзей.

Лепшыя мясціны нарыса Аляксея Кулакоўскага напісаны пафасна, мовай гнуткаю і выразнаю, прасякнуты прыўзнятым, лірычным настроем. Многія факты ў нарысе, асветленыя публіцыстычнай думкай аўтара, пакідаюць след у памяці. Нарысіст здолеў належным чынам размеркаваць, скампанаваць сюжэтна жыццёвы матэрыял.

Чытачы пазнаёмяцца ў нарысе са слаўнымі працоўнымі справамі будаўнікоў.

Працоўная біяграфія маладога прахадчыка Уладзіміра Навумовіча пачалася на будоўлі. Учарашні калгаснік, ён стаў вопытным спецыялістам, заваяваў павагу і аўтарытэт. Навумовіч — ударнік камуністычнай працы. І нездарма на будоўлі гавораць: што пройдзе праз рукі Уладзіміра—ці будзе гэта выбарка грунту, ці мацаванне ствала, ці якая іншая работа—таго папраўляць не трэба.

Ініцыятыўны чалавек і добры арганізатар брыгадзір комплекснай камсамольска-маладзёжнай брыгады Іван Чабатар. Па-гаспадарску клапоціцца ён аб якасці работ, нястомна шукае новых метадаў і форм кіраўніцтва, лепшай расстаноўкі людзей. У брыгадзе Чабатара выбран, напрыклад, савет з найбольш актыўных, аўтарытэтных рабочых, які штодня падводзіць вынікі работы, адзначае добрае і благое, намячае заданні на заўтрашні дзень. Па метаду чабатараўцаў цяпер працуюць на будоўлі амаль што ўсе будаўнічыя брыгады.

Аўтара «Зорак салігорскіх» цікавіць не кожная падзея на будоўлі, не любы факт. Ён вылучае падзеі найбольш істотныя, факты найбольш важныя. Прабіўка, скажам, шахтавых ствалоў на глыбіню да чатырохсот метраў—рэч надзвычай складаная. На будаўніцтве яна ўскладнілася яшчэ і тым, што ў месцы прабіўкі былі *выяўлены плывуны.* Ніякая *вядомая да той пары* тэхніка не магла іх адолець. Але воля і розум чалавека знайшлі выйсце: была пабудавана станцыя замарожвання глебы. Гэты факт важны як сам па сабе, так і ў сэнсе паказу мужнасці, стойкасці, спрыту будаўнікоў.

Аб рысах новага, перадавога ў свядомасці, у побыце рабочых будоўлі сведчыць такі ўбачаны і апісаны нарысістам факт: у ленкутках маладзёжных інтэрнатаў стаяць без прадаўца столікі продажу прадметаў першай неабходнасці.

Задума нарысіста—расказаць, як нараджаўся і рос камбінат, раскрыць працавітасць і маральнае хараство яго будаўнікоў, на жаль, не ўсюды ў нарысе знайшла дасканалае ўвасабленне. Аўтар шчодра падае працоўныя біяграфіі будаўнікоў. Але, на жаль, за імі часта не відаць непаўторных чалавечых характараў. Сапраўды, хіба можа паўстаць канкрэтны вобраз чалавека з такога, напрыклад, паведамлення: «Інжынер Леанід Палякоў, як аўтар многіх каштоўных прапаноў па ўдасканаленню вытворчасці, зноў пачаў часта задумвацца, шукаць новых метадаў праходкі. І хутка былі пададзены вельмі карысныя прапановы... Іншы раз інжынер падаваў думку, а брыгадзіры, звеннявыя і проста шахцёры развівалі яе... Часцей жа бывала так, што рабочыя падказвалі тую ці іншую ідэю, а інжынер правяраў і тэарэтычна абгрунтоўваў яе».

Найбольш запамінаецца ў нарысе дзед Міканор. Аўтар заўважыў і ўмела раскрыў перад чытачом самыя характэрныя рысы яго натуры. Чаго варта хоць бы такая сцэна: калі былі здабыты з-пад зямлі першыя кілаграмы спажыўнай солі, дзед датуль не верыў, што яна сапраўдная, пакуль не кінуў драбок гэтай солі ў міску з крупнікам.

Шкада, што бегла, агульна гаворыць аўтар пра само будаўніцтва. Чытачу хацелася б ведаць, скажам, як вядзецца праходка шахтавых ствалоў, што такое «цюбінг», «капёр» і г. д. Шахтабуд—першая, пакуль адзіная ў сваім родзе будоўля на беларускай зямлі, і тлумачэнні, *падрабязнасці толькі ўзмацнілі б* пазнавальную вартасць нарыса.

Не вельмі прыемна сустракаць у нарысе мясціны, якія пераказваюць старонкі аповесці гэтага аўтара «Тут я жыву...» Так, Васілёва «пярэстая кабыла» — сімвалічнае, так сказаць, увасабленне дарэвалюцыйнага сялянскага жыцця—з аповесці перавандравала ў нарыс. Тут яна таксама і пярэстая, і нядошлая. Васіль Тумаш у аповесці «...кідаў воз і ішоў шукаць дзе-небудзь якой травіцы ці хоць руні каліва, каб падкарміць жывёліну» (стар. 95), у нарысе—«плюнуўшы, кідае... бацька воз, ідзе шукаць для пярэстай якой-небудзь падкормкі» (стар. 5).

Нарыс «Мая Гродзеншчына» Аляксея Карпюка — напісан у іншым плане. Калі А. Кулакоўскі дзеліцца з чытачом уражаннямі пра асабіста бачанае і пачутае, дык А. Карпюк, апрача расказаў аб нашым сёння, заглядвае і ў мінулае, дае звесткі і лічбы гісторыка-геаграфічнага, эканамічнага, статыстычнага парадку, выкарыстоўвае архіўныя матэрыялы.

Шмат дзе пабываў, шмат што пабачыў аўтар на сваёй роднай Гродзеншчыне. Яго знаёмыя—людзі простыя і працавітыя, са шчырай душой і крылатымі марамі. Вось сям'я калгасніка Гецольда з Мастоўскага раёна. За адзін толькі год яна дала калгасу сорак тысяч рублёў прыбытку!

Расказваючы пра сённяшні дзень, нарысіст не-не ды і прыгадае мінулае. Такія супастаўленні — ці то гаворка ідзе аб лёсе народа, ці аб лёсе асобнага чалавека — пераканальна сведчаць, якія велізарныя змены адбыліся за гады Савецкай улады ў жыцці, у псіхалогіі людзей аднаго з куткоў былога Заходнебеларускага краю. У заключнай частцы нарыса «Пра «самабытнасць» гаворыцца аб росце прамысловай магутнасці Гродна, аб новым чалавеку. Вынаходніцтва, рацыяналізатарства, абмен вопытам паміж рабочымі — у нашых умовах звычайная з'ява. А дваццаць гадоў назад? Аўтар прыводзіць такі выпадак. На тэкстыльнай фабрыцы ў мястэчку Гарадок адзін з рабочых працаваў адразу на двух станках, за што атрымліваў большую зарплату. Каб не выдаць сакрэту, ён у час работы закрываў станкі фанернай будкай, а ля ўваходу ў яе ставіў на варту сына.

Многае скажуць чытачу і лічбы, прыведзеныя ў нарысе. На сарака двух гродзенскіх прамысловых прадпрыемствах працуе сем з паловай тысяч рабочых; пры ўладзе пілсудчыкаў у Гродна была толькі адна «навучальная» ўстанова... курсы падкоўвання коней. Сёння ж тут — дваццаць чатыры навучальныя ўстановы...

Аляксей Карпюк раскрывае характары людзей не праз апісанне, а паказвае чалавека ў дзеянні, у сутыкненнях з іншымі людзьмі. Нарысіст смела, але ў меру, прыбягае да мастацкага домыслу, што завастрае, робіць больш выразным вобраз.

Не задаволіць чытача трэцяя, даволі вялікая, частка нарыса («Гаспадар»), напісаная вельмі няроўна: Пакуль гутарка ідзе пра былое — нарыс чытаецца; калі ж аўтар пераходзіць да галоўнага — паказу калгасных будняў — знікаюць жывыя людзі, пачынаецца дэкларацыйнасць, *слоўная траскатня.* Павярхоўнасцю грашыць сёмая частка нарыса («Нёманскія вадалазы»). Аўтар дрэнна ведае тое аб чым піша: работу вадалазаў, што ачышчалі фарватэр Нёмана. Таму, акрамя прозвішчаў ды агульных месц, тут, па-сутнасці, нічога няма.

Слова ў нарысе А. Карпюка — пераважна эканомнае, сказ энергічны. Адчуванне слова, уменне карыстацца ім, добрая назіральнасць заўважаюцца і пры апісанні падзей, і пры характарыстыцы чалавека, у дасціпных, запамінальных параўнаннях: «Конік... такі маленькі, што, здаецца, прывязаны да аглабель, і такі худы, што не разбярэш, дзе дуга, а дзе рэбры. Скура на коніку — быццам паношаная світка, на баках абдзёртая да мяса, уся ў драпінах і струпах».

Праўда, там-сям ёсць і зрывы. Як натужна, напрыклад, чытаецца такі няўклюдны, груваcткі перыяд: «...масіўныя памешчыцкія пабудовы сялянам здаваліся вяршыняй гаспадарчай дасканаласці. Цяпер наяўнасць сродкаў дала магчымасць пабудаваць фермы настолькі лепшыя за памешчыцкія, наколькі тыя былі лепшыя за ўбогія сялянскія хлявы з вышчаранымі рэбрамі латаў».

Абодва нарысы — і Аляксея Кулакоўскага «Зоркі салігорскія» і Аляксея Карпюка «Мая Гродзеншчына»— творы, безумоўна, карысныя. Бясспрэчна іх пазнавальная вартасць. Але, *пранікаючы ў жыццё,* ведучы разведку на яго перадавых рубяжах, неабходна глыбей зазіраць у справы і думы чалавека-стваральніка, паўней адлюстроўваць героіку сённяшніх дзён. Такая задача пад сілу абодвум нарысістам. Сведчанне таму — мастацкая практыка гэтых здольных пісьменнікаў.

М. ЦІХАНЧУК.

Навукова-атэістычная канферэнцыя

Па ініцыятыве Ільянскай раённай бібліятэкі ў мясцовым сельскім Доме культуры адбылася навукова-атэістычная канферэнцыя. На ёй прысутнічала больш 300 рабочых саўгаса «Асцюковічы», студэнты Ільянскага ветэрынарнага тэхнікума, калгаснікі.

З цікавым дакладам аб узнікненні жыцця на Зямлі выступіў выкладчык ветэрынарнага тэхнікума А. Лапега. Студэнт І. Ціцішын расказаў аб шкоднасці рэлігіі. З вялікай цікавасцю прысутныя слухалі выступленне лектара Вілейскага гаркома партыі тав. Лукшы. Затым выкладчыца Т. Піткевіч прадэманстравала доследы, якія выкрываюць шарлатанства царкоўнікаў. Прадэманстраваны кароткаметражныя кінафільмы на антырэлігійную тэму.

Ул. БРЫЛЬ.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

Радыё для вучняў

У 11 нумары нашай газеты за г. г. было змешчана пісьмо дырэктара Дзяржынскай сямігадовай школы Я. Гаварушкі пад назвай «Радыё павінна дапамагчы». Аўтар пісьма прапанаваў арганізаваць спецыяльныя музычныя радыёперадачы, якія дапамагалі б выкладанню спеваў у школе.

Рэдактар музычнага вяшчання для дзяцей Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў БССР тав. Лапцева паведаміла, што рэдакцыя дзіцячых перадач вырашыла два разы ў месяц рабіць перадачы, у якіх будуць развучвацца песні, што ўваходзяць у школьныя праграмы. Таксама будзе арганізаваны цыкл канцэртаў па школьнай праграме.

„Хіба гэта сумленна?“

У пісьме ў рэдакцыю Рыгор Барадулін паведамляў аб недакладнасцях, дапушчаных А. Паляковым у інфармацыі «Апошні верш зборніка», змешчанай у газеце «Мінская праўда» за 10 снежня мінулага года.

Рэдакцыя газеты «Мінская праўда» паведамляе, што пазаштатны аўтарскі савет аддзела інфармацыі строга папярэдзіў аўтара тав. А. Палякова (А. Пустахода).

ПЕРШЫЯ СПРОБЫ

У мінулы панядзелак, увечары, у зале Саюза кампазітараў сабраліся кампазітары-прафесіяналы і самадзейныя аўтары — удзельнікі створанага чатыры месяцы назад творчага семінара.

Прагучалі мелодыі мала вядомых яшчэ аўтараў Р. Гуськова, С. Каралёва, М. Лагуна, Ул. Карызны, І. Нагаўкіна, Д. Шчарбіны і Д. Ялавіцара. Іх творчасць была прадстаўлена рознымі жанрамі (лірычная песня, хоры, вакальныя дуэты, фартэпіянныя п'есы і нават маршы для духавога аркестра). Праўленне саюза спецыяльна наладзіла гэты своеасаблівы канцэрт-паказ, каб усебакова пазнаёміцца з удзельнікамі семінара пачынаючых аўтараў.

З праслуханых твораў вылучаюцца: *жаночы хор «Беларусь мая»* Ул. Карызны, напісаны ім на свой тэкст, фартэпіянныя п'есы (танец, марш і вальс) І. Нагаўкіна, які валодае цікавым гарманічным чуццём. Д. Шчарбіна зарэкамендаваў сябе даволі ўдалымі песнямі «Ходзіць месяц» (словы К. Буйлы) і «Калыханка» (словы М. Машчары).

Дэталёвае абмеркаванне твораў, выкананых у справаздачным канцэрце спевакамі радыё, паказала, што сярод самадзейных аўтараў ёсць безумоўна таленавітыя людзі. Аднак усім ім не хапае трывалых тэарэтычных ведаў па гармоніі, паліфоніі і інструментоўцы, навыкаў харавога пісьма. Таму кожны ўдзельнік семінара, калі ён хоча дасягнуць высокіх вынікаў у творчай працы, павінен сістэматычна наведваць заняткі, *настойліва павышаць сваю кампазітарскую тэхніку.*

Вельмі пажадана, каб усе ўдзельнікі семінара рэгулярна хадзілі на канцэрты, больш слухалі музыку розных жанраў. Пачынаючым аўтарам варта заняцца і аваладаннем асновамі фартэпіяннай ігры, што пашырыць іх музычны кругагляд і дапаможа пазнаць фактуру суправаджэння.

Кіраўнік семінара кампазітар Г. Вагнер і кампазітар-педагог Ул. Чараднічэнка і надалей будуць дапамагаць пачынаючым аўтарам Мінска. У канцы мая вырашана правесці другі справаздачны вечар удзельнікаў семінара — падвядзенне вынікаў першага «навучальнага года».

Беларускія кампазітары і музыказнаўцы пры ўдзеле рэспубліканскага і абласных дамоў народнай творчасці пастаянна дапамагаюць пачынаючым аўтарам на месцах. Толькі за апошні час на абласныя семінары выязджалі: у Брэст — М. Аладаў, у Віцебск — Ул. Чараднічэнка, у Гомель — І. Ронькін. Некаторыя члены кампазітарскай арганізацыі Беларусі кансультавалі народных стваральнікаў песень Мінскай вобласці.

Мы чакаем ад пачынаючых аўтараў новых самабытных, жыццярадасных песень пра выдатных савецкіх людзей — будаўнікоў камунізма, пра наша шчаслівае сёння і яшчэ больш радаснае заўтра. Разам з кампазітарамі-прафесіяналамі самадзейныя аўтары ўнясуць свой уклад ва ўсенародную падрыхтоўку да XXII з'езду КПСС.

Я. ЦІКОЦКІ,
кампазітар, народны артыст СССР.

На здымку:
Кампазітары **М. Аладаў** і **Г. Вагнер** (у цэнтры) сярод удзельнікаў пастаянна дзеючага семінара самадзейных аўтараў пры Саюзе кампазітараў БССР.

Фота **Л. Папковіча.**

коў слова, і тое новае, што ўнёс ён сваім творам у скарбніцу нацыянальнай літаратуры.

Крытык абгрунтавана вядзе гаворку аб тым новым інтэлектуальным і маральным абліччы народа, «якое так выдатна выявіў Піліп Пестрак і якое складае самае каштоўнае ў яго творы».

Гаворцы аб традыцыях і наватарстве ў рамане «Сустрэнемся на барыкадах» прысвечаны многія добра напісаныя старонкі артыкула.

Рэвалюцыйная эпоха, асветленая полымем векапомнага Кастрычніка, *нарадзіла ў працоўных людзей* Заходняй Беларусі зусім новыя рысы характару: узрослую палітычную свядомасць, вернасць рэвалюцыйным і нацыянальным традыцыям, калектывізм і інтэрнацыяналізм, класавую салідарнасць і ўзаемадапамогу. *Эмацыянальна, жыва і страсна (часамі з адценнем дабрадушнага гумару)* піша крытык аб гэтых новых рысах характару ў герояў рамана «Сустрэнемся на барыкадах»: «І да рэвалюцыі, вядома, мог быць такі своеасаблівы стары, які ў вочы панам гаворыць праўду, так, як гаворыць ім Нічыпар. А ён гаворыць вось што: «Паны павінны ўцячы за Буг!» Яны яму ў плечы «бух ды бух», а ён усё роўна крычыць, што панам трэба ўцякаць за Буг. Але вось, калі мы бачым, што гэтыя ж і падобныя да яго непісьменныя сяляне цікавяцца, у якім баку знаходзіцца Іспанія, і калі маладыя вясковыя хлопцы ідуць туды, у Іспанію, змагацца за яе свабоду, дык гэта з'ява новай рэвалюцыйнай эпохі. Не трэба думаць, што яна не мае сваёй прадгісторыі. У 1902 годзе, у час англа-бурскай вайны, вёскі нашы таксама з вялікім спачуваннем у дачыненні да прыгнечаных тады бураў спявалі песню: «Трансваль, Трансваль», але каб у іх узнікла жаданне ісці змагацца за гэты «Трансваль», а галоўнае, каб знайшлася сіла, якая магла б павесці іх на гэтае змаганне, дык аб гэтым не магло быць і гаворкі. А цяпер вось *аб чым думае ў турме* Андрэй Касцевіч: «...грымі, грымі, дарагая Іспанія. *Хлопцы ўжо добра ведаюць* тваю геаграфію, твае правінцыі, рэкі, горы».

Цікавыя і пераканаўчыя думкі крытыка пра сюжэт і кампазіцыю твора, пра нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў характары станоўчых герояў рамана і інш.

Высокі па прафесіянальнаму ўзроўню і артыкул, прысвечаны творчасці Янкі Брыля. Крытык прасочвае, як паступова пісьменнік асвойвае сучасную тэму, *малюе* працэс крышталізацыі новага чалавека, яго барацьбу з рэшткамі мінулага, яго станаўленне як грамадскай асобы, асэнсоўвае тое новае, своеасаблівае, што прыйшло на прасторы Заходняй Беларусі пасля *верасnёўскіх падзей 1939 г.*

Старонкі, дзе гутарка ідзе пра «Марылю», «Галю», «Праведнікаў і зладзеяў» і аповесць «У Забалоцці днее», вызначаюцца асаблівай глыбінёю аналізу. Крытык вучыць чытача пранікаць у сутнасць твора, разумець яго падтэкст. Ён кваліфікавана гаворыць аб майстэрстве пісьменніка, аб яго творчай вучобе ў класікаў, аб яго ўменні знаходзіць у жыцці непаўторныя рысы, маляваць пластычна выразныя вобразы і карціны.

Прыцягваюць да сябе ўвагу чытачоў і тыя артыкулы кнігі, у якіх разглядаюцца творы Петруся Броўкі і Івана Шамякіна. Яны змястоўныя, палемічна завостраныя, напоўнены глыбокімі думкамі, супастаўленнямі і параўнаннямі.

Пераважная большасць артыкулаў напісана крытыкам з глыбокім пранікненнем у сутнасць літаратурных з'яў і працэсаў. І ўсё ж, на вялікі жаль, такі наш вывад нельга пашырыць на ўсе матэрыялы, змешчаныя ў кнізе. Некаторая частка іх задаволіць не можа. Так, артыкулы пра Змітрака Бядулю, пра раман «Трэцяе пакаленне» Кузьмы Чорнага і апавяданні Янкі Маўра (хоць і ёсць у іх цэлы шэраг цікавых *назіранняў) напісаны крытыкам* ніжэй сваіх магчымасцей. Для *гэтых артыкулаў характэрны агульшчына,* дэкларацыйнасць, кампазіцыйная раскіданасць, цытатніцтва, адсутнасць адзінай цэментуючай думкі, неадшліфаванасць мовы і стылю.

Любіць Алесь Кучар прыводзіць урыўкі з літаратурных тэкстаў. Пры гэтым ён абмяжоўваецца надзвычай кароткімі каментарыямі, накшталт: «характарыстыка класічная». На старонках 151—152 ён, *напрыклад, прыводзіць вялікую цытату* з апавядання Янкі Маўра і потым робіць наступнае заключэнне: «Цяпер мы ведаем з вамі, дарагі чытач, што такое мастацтва—*праўдзівае ў дэталях, глыбокае* па думцы, дасціпнае па сюжэту, чалавечнае, шчырае». Усё, што тут сказаў крытык, пярэчанняў не выклікае. Але бяда ў тым, што мы павінны верыць крытыку на слова, бо ён не давёў, не абгрунтаваў сваёй думкі.

Бывае ж і так, што ў кнізе прыводзяцца такія вытрымкі з літаратурных тэкстаў, якія ніяк не пацвярджаюць выказаных крытыкам думак. Алесь Кучар, напрыклад, сцвярджае, што ў творах Янкі Купалы і Якуба Коласа прыгнечаны чалавек паўстаў «**ва ўсёй рэвалюцыйнай велічы** (падкрэслена мною. — **А. М.**) і маральным характве». У доказ такой сваёй думкі ён спасылаецца на маналог Лявона Зябліка з «Раскіданага гнязда»: «З зямелькай зжыўся, як з роднай маткай. Кожны каменьчык на полі і кожны кусцік на сенажаці змалку ўжо знаў... На гэтых гонейках пасвіў скаціну... араў, сеяў, касіў... А тут!.. Суд — вон выганяюць. Кінуць тую хату, скуль бацьку і матку на могілкі вывез, кінуць тое поле, дзе кожную скібіну потам крывавым скрапіў...». Відавочна, гэтыя словы героя нічога не могуць *сказаць аб яго рэвалюцыйнай велічы.*

Яшчэ адзін прыклад няўмелага карыстання цытатамі. Імкнучыся даказаць, што ў Бядулеўскім апавяданні «Дванаццацігоднікі» рэалізм пераплятаецца з рамантыкай, крытык зноў-такі ў пацвярджэнне думкі прыводзіць словы галоўнага героя апавядання, у якіх нічога рамантычнага няма: «Лявон сказаў слабым дрыжачым голасам:

— Вось усе гэтыя апошнія гады злосць на цябе трымала мае сілы. Як куслівую гадзіну, я грэў у сваіх грудзях пякельную помсту на пана за тое, што ты знішчыў нашыя, крывёю і потам здабытыя гаспадаркі. Во гэтымі каравымі рукамі я яшчэ хацеў задушыць пана, але ўстрымаўся: не хацеў паганіць свае чэсныя мазолістыя рукі панскай нячыстай крывёю...»

Заслугоўвае адабрэння той факт, што Алесь Кучар спрабуе вырашыць пытанне аб станаўленні метаду сацыялістычнага рэалізму ў творчасці Зм. Бядулі. Аднак разважанні крытыка на гэтую тэму непераканаўчыя. Так, ён гаворыць, што ў ранніх творах Зм. Бядулі перабольшанне не вяло да тыпізацыі, ператваралася ў абсалют. Калі ж пісьменнік пачаў авалодваць метадам сацыялістычнага рэалізму, то гэтае перабольшанне ўжо стала выступаць у яго як адзін з метадаў мастацкай тыпізацыі.

Паўстае пытанне: а як быць з Гогалем, Салтыковым-Шчадрыным, Л. Талстым, у якіх перабольшанне, гіпербала таксама былі адным з метадаў мастацкай тыпізацыі? Па логіцы разважанняў крытыка вышэйпамянёных пісьменнікаў можам смела назваць сацыялістычнымі рэалістамі.

Часамі аналіз ідэйнага зместу літаратурных твораў крытык адрывае ад аналізу іх мастацкай формы. На старонцы 30 чытаем: «Усе гэтыя творы («Беларусь», «У Ясных Крушнях», «З сказаў буры і віхораў», «Чырвона-чорная жалоба», «Чырвоны каляндар». — **А. М.**), вызначаюцца непатрэбнай рытарычнасцю, але ў сэнсе ідэйным у творчым шляху Зм. Бядулі яны мелі вялікае значэнне».

Калі паслухаць крытыка, дык можна падумаць, што ідэйнасць у літаратурным творы існуе самастойна і незалежна ад мастацкасці і наадварот. Але ж гэта не так! Нельга раз'яднаць, расшчапіць ідэйны і мастацкі бакі ў літаратурным творы. «Усякае пачуццё і ўсякая думка, — гаварыў Бялінскі, — павінны быць выказаны вобразна, каб быць паэтычнымі».

Стыль і мова названых артыкулаў А. Кучара таксама не вызначаюцца высокай культурай. Крытык ужывае такія словы (іх называюць словамі-паразітамі), без якіх можна лёгка *абысціся: «трэба сказаць», «трэба,* аднак, адзначыць», «тут трэба сказаць», «трэба адзначыць» і г. д.

Многія выразы і сказы недапрацаваны стылістычна. Прывядзём некалькі прыкладаў: «Свае фармальныя набыткі траціў пісьменнік на дробныя, да немагчымасці суб'ектывісцкія, тэмы»; «Імперыялістычная вайна 1914 года ў сваім крывавым млыне перамалола маладое пакаленне — аздобу народа»; «Яго (Кузьмы Чорнага. — **А. М.**) творчыя поспехі былі проста накіраваны супраць мяшчанскага апявання ў лёгкіх какетлівых тонах «асалод цела» і трагічна-непазбежнага «любоўнага трыкутніка»; «У чалавека, які ўпарта закопвае сваю душу ў гной уласніцкай прагавітасці, могуць быць свая радасць, боль, пакута».

Як бачым, каштоўнасць манаграфічных прац, уключаных у кнігу «Аб мастацкай прозе», неаднолькавая. Кідаецца ў вочы іх рэзкі якасны кантраст. Побач з артыкуламі змястоўнымі, паэтычна натхнёнымі, у кнізе змешчаны і такія, якія мала чаго новага ўносяць у нашу літаратуразнаўчую навуку, бо яны — даніна шэрай, шаблоннай невыразнай крытыцы.

А. МАКАРЭВІЧ.

Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага паказаў новую работу—спектакль «Дванаццатая гадзіна» па п'есе А. Арбузава.

На здымку: сцэна са спектакля. У ролях: Дор — народны артыст РСФСР **С. Бірукоў**, Ганна — заслужаная артыстка БССР **А. Клімава.**

Музычная гутарка

Споўнілася 110 год з дня смерці рускага кампазітара А. Аляб'ева, сучасніка вялікага Глінкі. Мінская гарадская нотная бібліятэка і кінатэатр «Перамога» наладзілі для гледачоў музычную гутарку, прысвечаную А. Аляб'еву. Пра жыццёвы і творчы шлях кампазітара расказала студэнтка Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ж. Базылянская. Заслужаная артыстка БССР Т. Пастуніна і артыст Ю. Матраеў выканалі вакальныя творы кампазітара — рамансы «Салавей», «Іртыш» і інш.

Новы спектакль

Сваю новую работу — спектакль па п'есе грэчаскага паэта і драматурга Алексіса Парніса «Востраў Афрадзіты» пачаў паказваць працоўным горада Гомельскі абласны драматычны тэатр. Паставіў п'есу заслужаны дзеяч мастацтваў Латвійскай ССР Б. Рошчын, афармленне мастака В. Палетыкі.

В. СЯМЕНАЎ.